# СВАБОДА

№ 12 15—31 кастрычніка 1993

Кошт 30 рублёў

ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Рэдактар Ігар ГЕРМЯНЧУК
Выдавец Павал ЖУК

АДРАС ДЛЯ КАРЭСПАНДЭНЦЫІ:
220029, Менск,
вул.М.Багдановіча, 7а





Здымак Сяргея БРУШЦКО

*Ліст на першую паласу*

## Лепш адзін раз пастаяць на плошчы, чым кожны дзень у чарзе

**Размова была ў чарзе па хлеб. Дзядзька лаяў Кебіча, а цётка — «дэмакратаў». Аднак пад ціскам дзядзькавых аргумэнтаў цётка хутка пагадзілася, што «дэмакраты тут ні прычым». І пачала лаяць Кебіча. Дзядзька незадаволена буркнуў: «Лепш бы адзін раз пастаяла на плошчы, чым кожны дзень у чарзе». «Хадзілі і на плошчу, а што толку?!» — запярэчыла другая жанчына. «Слаба хадзілі!» — адрэзаў дзядзька.**

**Я думаю, ня варта чакаць, што на плошчу Незалежнасьці ў Менску прыйдзе 100 тысячаў грамадзянаў, каб патрабаваць «свабоды і дэмакратыі» (Менск — гэта ня Прага, не Бэрлін і нават не Сафія). Але «па кілбасу» — прыйдуць.**

**Аднак для гэтага мала таго бясспрэчнага факту, што праз «рэфарматарства» Кебіча народ стаў жабраком. Людзі прыйдуць на плошчу, калі будуць пераканаўныя, што дэмакраты сапраўды здольныя забясьпечыць ім годнае жыцьцё.**

**Я ў гэта веру, і таму я прыйду...**

**Леакадзія ВАРАКСА,**
**настаўніца**

Менск

## ФАКТ ЁСЬЦЬ ФАКТ

**СУСТРЭЧЫ** З 3 па 7 лістапада ў Менску па запрашэньні БНФ знаходзяцца лідары Хрысьціянскай дэмакратыі з Бэльгіі, Францыі, Італіі, Гішпаніі і іншых эўрапейскіх краінаў. 4 лістапада яны мелі дзьве сустрэчы ў Вярхоўным Савеце — са Старшынёй С.Шушкевічам і дэпутатамі ад Апазыцыі. 6 лістапада з удзелам замежных гасьцей адбудзецца канфэрэнцыя «Аб палітычных і эканамічных пытаньнях Беларусі».

**УЛАДА** 3 лістапада ў Горадні на нечарговай сэсіі гарсавету быў абраны новы мэр — Генрых Крупенка, які дагэтуль працаваў начальнікам упраўленьня камунальнай гаспадаркі гарвыканкаму. Ён нарадзіўся ў вёсцы Ласосна, што побач з Горадняй, паляк па нацыянальнасьці.

**ДРУК** Напрыканцы кастрычніка ў Баранавічах выйшаў з друку першы нумар газэты «Баранавіцкае слова». Гэта — штомесячнік мясцовай арганізацыі ТБМ.

**АДУКАЦЫЯ** З пачатку 1994 г. студэнтам Калюмбійскага ўнівэрсытэта (ЗША) будзе чытацца новы курс «Гісторыя і палітыка Беларусі». Чытаць лекцыі запрошаны Янка Запруднік — рэдактар нью-ёркскай газэты «Беларус». Ягоная кніга «Беларусь на гістарычным раздарожжы», якая толькі што выйшла на ангельскай мове ў ЗША, будзе своеасаблівым падручнікам для студэнтаў.

**ВІЗЫТЫ** 30—31 кастрычніка, у Горадні знаходзіўся Зянон Пазьняк з групаю дэпутатаў парляманцкае Апазыцыі. У першы дзень адбылася нарада з прадстаўнікамі дэмакратычных партыяў і рухаў. Размова ішла пра тактыку дзеяньняў на новых выбарах. У той жа дзень менскія госьці былі запрошаныя на абласную тэлестудыю, а ўвечары яны сустрэліся з гарадзенскаю грамадскасьцю. На сустрэчы прысутнічала каля 700 чалавек.

31 кастрычніка Зянон Пазьняк сказаў слова на адкрыцьці мэмарыяльнай дошкі на доме, дзе з 1978 г. па 1989 г. жыў вядомы беларускі гісторык і грамадзкі дзеяч, прафэсар Міхась Ткачоў. Шыльда была асьвечана настаяцелем Каложскай царквы айцом Анатолем.


Ф.СП-1

Міністэрства сувязі РБ
"Белсаюздрук"

АБАНЭМЭНТ на газэту 63887

СВАБОДА — Колькасьць камплектаў: 1

на 1994 год па месяцах:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| X | X | X | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ | Месца | літэр

на газэту 63887

СВАБОДА

Кошт: падпіскі 240 руб. 00 кап.; пера-адрасоўкі руб. кап. — Колькасьць камплектаў: 1

на 1994 год па месяцах:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| X | X | X | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозьвішча, ініцыялы)

**Падпіска заканчваецца 15 лістапада**



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Сьледзтва ў тупіку?

**Расьсьледваньне справы аб забойстве Дз.Арцымені зайшло, відаць, у тупік. На такую думку наводзіць той факт, што сьледчая група пачала сур'ёзна правяраць вэрсыю аб «палітычным забойстве», якую выказала адразу пасьля трагедыі жонка нябожчыка.**

З гэтай прычыны ў абласное КДБ па чарзе выклікалі на допыт лідараў мясцовых палітычных арганізацыяў: старшыню гарадзенскай філіі БСДГ Міхала Патрэбу, старшыню абласной Рады БНФ Кастуся Жыня, лідара грамадзка-палітычнага аб'яднаньня імя Каліноўскага сп.Селязьнёву, а таксама старшыню Саюза палякаў Тадэвуша Гавіна.

М.Патрэба адмовіўся даваць якія-небудзь паказаньні па «делу убийства Дмитрия Константиновича», заявіўшы сьледчаму КДБ таварышу Музычэнку, што расцэньвае гэты допыт як палітычную правакацыю. А К.Жынь скарыстаў гэты выклік, каб прачытаць сьледчаму пэрсанальную лекцыю на тэму сувэрэнітэту.

**С.А.**

# З помнікамі абыходзяцца па-варварску

### А Дзяржаўная інспэкцыя не зьвяртае на гэта ўвагі

На Беларусі працягваецца кампанія масавага вяртаньня сьвятыняў праваслаўнай і каталіцкай цэрквам. Гэта, безумоўна, станоўчая сама па сабе зьява. Аднак за час стыхійнага пераходу ад атэізму да веры сфармавалася магутнае лобі царкоўнай іерархіі. У распухлых структурах дзяржаўнай улады ўтварылася ніша з чыноўнікаў ды палітыкаў, якім засталося спадзявацца толькі на Бога. Таму гэтак шпарка вяртаюць яны канфэсіям іхнюю маёмасьць, пры гэтым песьцячы думку, што духавенства аддзячыць ім падчас будучых выбараў. Лабісты любяць праехацца з самім Мітрапалітам Філарэтам у ягоным «мэрсэдэсе» або прыняць публічны хрост, «вкусить» асалоду малебну ў іхні адрас і разьдзяліць высокую трапезу з іерархамі.

Камуністычныя ўлады імкнуцца пераканаць сьвятарства, што менавіта яны адчынілі «дзьверы ў храм», што нібыта яны і зьяўляюцца сапраўднымі дэмакратамі. А вось «нацыяналісты», маўляў, не прыхільныя да царквы, таму і кідаюць у яе бок камяні. Словам, сьцеражыся іх, бо яны гэтыя дзьверы зноў могуць зачыніць.

Прыкладна так у асноўным разважае і шматпаважанае сьвятарства. Па-свойму разумее яно і дэмакратыю. Паназьбіраўшы сьвятыняў, ксяндзы і праваслаўныя сьвятары пачалі перарабляць сьвятыні на свой капыл, паводле прынцыпу «што бачу, тое і малюю». Ужо пазначыліся пэўныя тэндэнцыі: папы намагаюцца прышчапіць да цэркваў «цыбуліну», а ксяндзы — накрыць сьвятыню меднай бляхаю. І тут, бач, ізноў на свабоду творчасьці духавенства замахнуліся «нацыяналісты».

Між тым прэтэнзіі да «навадойлідаў» маюць усе падставы. Пачнем з гістарычнага цэнтру Менска, дзе касьцёл бэрнардынак апаселі наватары з праваслаўнай царквы. Не пасьпелі мы міргануць вокам, як зьявілася не характэрная для архітэктуры Беларусі мазаіка, прыплюснуты, а не барочны дах. Спэцыялісты аднaзначна называюць гэта «гвалтоўным умяшаньнем у помнік». Прычым, як зазначыў намесьнік старшыні Дзяржаўнай інспэкцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны А.Краўцэвіч, найбольшая небясьпека помнікам зыходзіць менавіта ад праваслаўнай царквы, бо яе палітыка «не ўлічвае адметнасьці беларускай культуры».

Напрыклад, у Воршы сьвятары адмовіліся кіравацца праектам рэстаўрацыі Сьвятадухаўскай царквы, бо ён, маўляў, «зроблены па ўніяцкіх канонах». Сапраўды, усё, што выпадае з маскоўскіх канонаў, не ўспрымаецца Расейскай праваслаўнай царквой на Беларусі. Настаяцель Навагрудзкай Барысаглебаўскай царквы XII—XVII ст. зьбіраецца прычапіць на храм яшчэ адну «цыбуліну», каб падвысіць «чын благачыннага». У Віцебску, на тэрыторыі Ніжняга Замку, побач з рэшткамі Благавешчанскай царквы паўстала драўляная каплічка а-ля Кіжы. Гэты прывід паўночна-расейскага дойлідства бы тая скула выскачыў на старажытным замчышчы. У Мураванскай царкве-крэпасьці падчас рамонту была зьнішчаная адзіная на Беларусі ацалелая дахоўка XVI ст. У Кобрынскай царкве XVIII ст. сьвятар перабудаваў купалы без узгадненьня са спэцыялістамі і нанёс шкоду помніку. Касьцёл у Крывошыне, перабудаваны раней пад Пакроўскую царкву, пачалі рамантаваць, груба парушаючы мэтодыку, сумніцельныя рэстаўратары. Зараз паства гэтай царквы падзялілася на дзьве часткі: адна адстойвае былога сьвятара і ягонае «наватарства», другая — новага сьвятога айца, які лічыць, што трэба прыслухоўвацца да спэцыялістаў. А тым часам сьвятыню псуюць.

Але асабліва адзначым горкі лёс нашых найстарадаўніх сьвятыняў: Каложскай царквы ў Горадні і Спаса-Ефрасінеўскай у Полацку. Былы сьвятар Каложскай царквы рабіў усё, што яму хацелася. Па старажытных сьценах пусьціў чорны дрот электраправодкі і разводку ацяпляльнай сыстэмы. У глыб сьцяны загналі жалезныя шворны і на іх панавешвалі батарэі. У апсыдзе помніка бацюшка заклаў кацельню, а ў ахоўнай зоне выкапаў катлаван для сваёй хаты. І самае прыкрае, што экзархат у Менску ведаў пра ўсё гэта. Але спыніць варварства ўдалося толькі намаганьнямі дэпутата Алега Трусава. Сьвятара перавялі ў іншае мейсца, але хто ведае, што распачне ён там.

А ў Спаса-Ефрасінеўскай царкве ў Полацку ўвесь час дымяць сьвечкі дрэннай якасьці, копцячы на выдатныя фрэскі XII ст. У такіх сьвятынях, на думку спэцыялістаў, нельга праводзіць службы часьцей за адзін-два разы ў год, бо інакш давядзецца забіваць цьвікі, вешаць электраправодку, сьвяцільнікі...

Здаецца, удалося спыніць наватара ад каталіцкай царквы, які пачаў крыць Чырвоны касьцёл у Менску бляхай, зрываючы традыцыйную дахоўку (гэта было прамым парушэньнем праекту). А інтэр'ер там зьбіраюцца размалёўваць таннай нямецкай фарбаю, якая прызначана для фарбаваньня тканінаў. (Дарэчы, на фасадзе прымацавалі шыльды з надпісам «Касцёл Сымона і Алены», але чамусьці толькі па-польску і па-беларуску. Калі дзяржаўнай моваю ў нас зьяўляецца беларуская, то на польскай, відаць, напісана для турыстаў зь Вялікай Брытаніі). На тэрыторыі Чырвонага касьцёла рыхтуюцца дзеля нечага катлаваны. Пад вокнамі Дома ўраду парушаюцца законы, але цяперашнія ўрадоўцы сочаць толькі за іншым помнікам, за які яны гатовыя судзіцца, — за чорнаю паставай Леніна.

Ня шэньціць і Гальшанскаму касьцёлу францысканаў, дзе з парушэньнем праекту рэстаўрацыі кладзецца бэтонная падлога. Выправіць гэта будзе ўжо немагчыма. У Гарадзенскім кляштары бэрнардынаў, дзе адкрылі духоўную каталіцкую сэмінарыю, страчана аўтэнтычная дахоўка, вокны зроблены абсалютна не ў стылі помніка, вядуцца неапраўданыя перабудовы. Падчас рамонту Гарадзенскага Езуіцкага касьцёла зьнішчана аўтэнтычная тынкоўка са старадаўняй афарбоўкаю. Усялюбскі касьцёл накрылі бляхаю, паклалі на падлогу бэтонныя пліты.

Трэба прызнаць, што помнікам беларускай архітэктуры наносіцца вялікая шкода, калі яны трапляюць у чужыя рукі. Прычым гэтым самым сёньняшнія палітыкі зацягваюць вузлы, якія будуць вымушаныя разьвязваць наступныя пакаленьні. Тут маюцца на ўвазе ня толькі ўніяцкія сьвятыні, якія трапілі ў рукі праваслаўных іерархаў, але і той жа цудатворны Кальвінскі збор у Заслаўі. З гэтай напаўсьвецкай, напаўрэлігійнай установы праваслаўны наватар лепіць нешта сваё, знаёмае і блізкае. Напрыклад, узводзіцца іканастас, якога тут ніколі не было.

Нахабства і варварства прамаскоўскага і прапольскага сьвятарства, што аніяк не ўспрымае беларускай культуры, пакрываецца тым жа лобі. Дзяржаўная інспэкцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пад кіраўніцтвам Дз.Бубноўскага аддала беларускую культуру на чарговае раскрыжаваньне. Нягледзячы на заканадаўства, ніводзін сьвятар ні да адміністрацыйнай, ні да крымінальнай адказнасьці, як гэта абумоўлена ў законе, ня быў прыцягнуты. Альбо для сьвятароў і сп.Бубноўскага законы няпісаныя, альбо гэтак яны разумеюць дэмакратыю.

Сёньня адсутнічае папраўдзе дзяржаўны падыход да гэтай праблемы. Відавочна, аддаючы помнік беларускай культуры новым гаспадарам, Дзяржаўная інспэкцыя павінна была б скласьці ахоўныя абавязацельствы і сачыць за іхнім выкананьнем. Але чамусьці не працуюць, марудзяць ахоўныя ўстановы, не працуе закон. Магчыма таму, што яны знаходзяцца ва ўлоньні Міністэрства культуры. А можа, варта падумаць пра ўтварэньне незалежнай інспэкцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны? Тым часам сьвятары сьпяшаюцца, хапаючы абы-які, танны матэр'ял, каб як найхутчэй прыстасаваць беларускую спадчыну для сваёй дзейнасьці. Таму й ня хочацца ім зьвязвацца з рэстаўратарамі, якім патрэбны немалы час, каб правесьці неабходныя дасьледаваньні, сабраць гістарычную інфармацыю па архівах, правесьці археалягічныя дасьледаваньні.

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**

**P.S.** *Калі быў падрыхтаваны гэты матэр'ял, рэдакцыі стала вядома, што Дз.Бубноўскі (старшыня Дзяржінспэкцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны) звольніў з працы свайго намесьніка А.Краўцэвіча. Ці не за тое, што ён залішне часта зьвяртаў увагу свайго начальніка на парушэньні заканадаўства?*

# Пакуль памежнікі вывучаюць курдзкую мову, па Нёмане сплаўляюць кантрабанду

**Беларуска-польская мяжа ўсё больш пачынае нагадваць міжваенную, якая часта перасякалася нелегальна ўначы па т.зв. «зялёных калідорах». Але калі раней парушальнікамі былі пераважна КПЗБоўцы, то цяпер — азіяты з афрыканцамі, якія складаюць 70% ад усёй колькасьці парушальнікаў. А навогул, за апошні час парушэньняў мяжы пабольшала ўтрая.**

Нелегальны рух праз мяжу адбываецца ў адзін бок — на захад. Прычым, гэтая зьява пачынае набываць дзёрзкі групавы характар. На 1-ай і 2-ой заставах Гарадзенскага пагранатраду затрымліваліся групы да 30 чалавек. Сярод парушальнікаў найчасьцей трапляюцца кітайцы, а таксама грамадзяне Пакістану ды Індыі.

Звычайна яны прыбываюць ў краіны СНД законным шляхам, а потым (праз тое, што Беларусь ня мае дзяржаўных межаў з Расеяй ды Украінай) без усялякіх перашкодаў гэтыя людзі трапляюць у нашую краіну. Далей яны наладжваюць сувязі з крымінальным бізнэсам, які за вялікія грошы арганізоўвае ім пераход беларуска-польскай мяжы.

Самае цікавае, што ў гэтай сытуацыі ўсе клопаты з затрыманымі парушальнікамі застаюцца цалкам самім памежнікам: вы злавілі — вы і разьбірайцеся. Больш яны нікому не патрэбныя. Па-першае, па сёньняшнім заканадаўстве вельмі цяжка прыцягнуць іх да адказнасьці. Па-другое, з парушальнікаў цяжка, альбо нават немагчыма, спагнаць грошы, каб кампэнсаваць страты на іх пошук, затрыманьне, а затым утрыманьне і дэпартацыю. Сёлетняя пастанова Саўміну №459 ад 13 чэрвеня дае такое права, але рэальна спагнаць грошы ўдаецца толькі ў тых, хто іх мае пры сабе. У іншых выпадках законнага мэханізму спагнаньня не існуе.

Нарэшце, злавіўшы парушальнікаў, памежнікі мусяць іх дапытаць. А тут ужо сытуацыя нагадвае вядомую показку, у якой безьбілетнік у адказ на пытаньне: Шпрэхэн зі дойч? Парле ву франсэ? і г.д. — толькі глядзіць зь непаразуменьнем. Рэч у тым, што, напрыклад, у згаданай 30-асабовай групе перабежчыкаў былі людзі, якія размаўлялі толькі на пушту, дары ды іншых рэдкіх мовах. Памежнікам у такіх выпадках трэба альбо выклікаць здалёк перакладчыкаў і аплочваць ім усе выдаткі, альбо самім сядаць за падручнікі.

У абавязкі Гарадзенскага пагранатраду таксама ўваходзіць і абарона беларуска-летувіскага ўчастку мяжы. Ёй нададзены статус дзяржаўнай, але, апроч гэтага, іншыя заканадаўчыя акты, якія кантралявалі б памежны рэжым, пакуль не прынятыя. Асабліва прыкра, што ўсталяваньне новай дзяржаўнай мяжы мала падмацавана матэр'яльна.

Па Нёмане, па лясных дарогах на летувіскі бок зьнікаюць дзесяткі мільёнаў рублёў у выглядзе каляровых мэталяў, паліва, спажывецкіх тавараў і г.д. Кіраўнікі памежных калгасаў настойваюць на ўвядзеньні ўздоўж паўночнай мяжы вобласьці пагранзоны. Такая прапанова перададзена камандаваньнем пагранатраду ў аблвыканкам, але пытаньне дагэтуль не разглядаецца.

Не задаволена таксама просьба памежнікаў аб выдзяленьні нармальных памяшканьняў для нядаўна створаных пастоў і пагранкамэндатуры, дзе былі б належныя ўмовы для людзей і тэхнікі. Пакуль жа службу даводзіцца несьці ў былых птушніках альбо кароўніках.

Штаты Гарадзенскага пагранатраду павялічваюцца. Цяпер сюды едуць служыць афіцэры зь іншых краінаў СНД (асабліва з «гарачых пунктаў»). Але прафэсійных памежнікаў усё адно не хапае, таму на службу бяруць афіцэраў зь іншых родаў войск.

Летувіская Рэспубліка аднабакова прыняла адпаведныя нарматыўныя дакумэнты, і з 1 кастрычніка ў Летуву можа прыехаць толькі той, хто мае замежны пашпарт. У той жа час летувісы прыязджаюць да нас па любых дакумэнтах. Прасьцей, адэкватныя захады зь беларускага боку не прымаюцца. Гэта выклікае непрыхільную рэакцыю сярод жыхароў Беларусі, асабліва ў памежных раёнах.

Нядаўна вырашана, што мытны і памежны дагляд будзе ажыцьцяўляцца не на памежнай зь Летувою станцыі Парэчча, якая знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, але дагэтуль належыць летувіскай чыгунцы, а на канцавых прыпынках на самой мяжы. Дзеля гэтага неабходна хутчэй выдзеліць час для стаянкі цягнікоў, вызначыць парадак перасячэньня дзяржаўнай мяжы цягніковымі брыгадамі, абслугаю. Беларускі бок з вырашэньнем усіх гэтых пытаньняў неапраўдана марудзіць.

Пакуль мы спрачаемся, ці патрэбная нам сапраўдная мяжа зь Летувою, летувісы ня думаюць, а дзейнічаюць.

**Сяргей МАКСІМОВІЧ**

# Ахвярам сталінізму

**2 лістапада, на Дзяды ў Горадні на будынку Саюза палякаў Беларусі была ўрачыста адкрыта мэмарыяльная шыльда, прысьвечаная памяці палякаў, якія загінулі ў сталінскіх лягерах.**

Гарадзкія ўлады апынуліся ў адыёзнай сытуацыі. Рэч у тым, што на пачатку году кіраўніцтва Саюза палякаў зьвярнулася ў гарвыканкам па дазвол на такую шыльду. У выканкаме прапанавалі не выдзяляць палякаў, а зрабіць шыльду ўсім ахвярам рэпрэсіяў, незалежна ад нацыянальнасьці. Кіраўніцтва Саюза мусіла пагадзіцца.

Прапанова была перададзена далей па інстанцыях, але ў аблвыканкаме справу забракавалі. Маўляў, трэба параіцца з гісторыкамі, каб тыя высьветлілі колькі і каго вывезьлі, колькі зь іх загінула і г.д. Кіраўніцтва Саюза чакала, чакала, дый, абвінаваціўшы гарадзкія ўлады ў бязьдзейнасьці, вырашыла самавольна зрабіць памятную шыльду, абмежаваўшыся надпісам толькі пра рэпрэсаваных палякаў. На паседжаньні гарвыканкаму вырашылі, што хоць шыльда прымацаваная без дазволу, давядзецца пагадзіцца з гэтым фактам. Трэба аддаць належнае, што на ўрачыстасьці былі згаданыя ня толькі палякі, але і беларусы, габрэі, расейцы — усе, хто загінуў у сталінскіх лягерах.

**Андрэй БАЛЬЦАРОВІЧ**





© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Кебіч зноў не на таго паставіў

**Папяровы марафон па стварэньні «рублёвай зоны новага тыпу» набліжаецца да фінішу. Пры гэтым падзеі разьвіваюцца хутчэй па інэрцыі, а не паводля лёгікі эканамічных і палітычных рэаліяў.**

Каб зразумець увесь камізм сытуацыі, у якой апынуўся наш урад, варта згадаць нядаўнюю гісторыю.

Яшчэ на пачатку года краіны СНД падпісалі пагадненьне аб стварэньні Міждзяржаўнага банка, які павінен быў спрасьціць сыстэму разьлікаў паміж дзяржавамі. Пачалася праца над праектам дамовы аб эканамічным саюзе. Пры гэтым у аснову міждзяржаўных разьлікаў павінна была быць пакладзена полівалютная фінансавая сыстэма, пры якой уводзіцца ўмоўная пераводная грашовая адзінка, а валюты дзяржаваў-удзельніцаў каціруюцца да яе і падтрымліваюцца рэзэрвовай сыстэмаю.

Такая сыстэма патрабуе ад дзяржаваў-удзельніцаў праводзіць жорсткую фінансавую палітыку, бо ня можа дапусьціць руху курса нацыянальных валютаў у адносінах да пераводнай больш за 5%. За «неўтрыманьне» курсу дзяржава-ўдзельніца павінна быць выключаная з сыстэмы разьлікаў.

Натуральна, што былы Вярхоўны Савет Расеі, які зацьвердзіў дэфіцыт бюджэту больш за 22 трлн.руб., ня мог пагадзіцца з гэткім жорсткім падыходам. У выніку прэм'ер Расеі В.Чарнамырдзін (які сам зьяўляецца прыхільнікам ВПК, агракомплексу, здабываючых галінаў, а значыць — інфляцыйнай палітыкі) пайшоў на стварэньне «рублёвай зоны», якая ўжо не патрабавала жорсткай стабілізацыі рубля, а мела на ўвазе адно толькі ўзгодненасьць дэфіцытаў і банкаўскіх ставак краінаў-удзельніцаў. Гэтая ідэя была падхопленая ва ўрадзе Беларусі, бо калі Расея будзе працягваць пустую эмісію рубля, Кебічу таксама перападзе панадны кавалак інфляцыйнага пірага ў выглядзе даведзенага нарматыву дэфіцыту бюджэту.

Аднак падзеі ў Расеі набылі драматычны характар. Вярхоўны Савет сышоў у нябыт, ва ўрад вярнуўся прыхільнік жорсткай фінансавай палітыкі Ягор Гайдар. Натуральна, што пры ўзмацненьні манэтарысцкага крыла ва ўрадзе Расеі (Гайдар, Фёдараў) рэалізацыя «рублёвай зоны» становіцца ўсё больш праблематычнаю. Наўрад ці яны пагодзяцца на крэдытную эмісыю, якую запатрабуюць на наступны год дзяржавы Сярэдняй Азіі і Беларусь. У выпадку ж, калі ў сьнежні новы парлямант Расеі зацьвердзіць прэм'ерам Гайдара замест Чарнамырдзіна, можна сказаць з даволі вялікаю ступеняй упэўненасьці, што «рублёвая зона» пойдзе да свайго заходу, а наш урад зноў апынецца каля разьбітага карыта, так і не стварыўшы «эканамічны саюз», «пра які так доўга гаварылі бальшавікі». Спад у беларускай эканоміцы хутчэй за ўсё скончыцца холадам у кватэрах і канчатковым развалам фінансавай сыстэмы, зьнешні доўг Беларусі вырасьце. А цэны на тавары ўзрастуць вышэй за сусьветныя, бо ў іх давядзецца залічыць і інфляцыйныя спадзяваньні Кебіча.

У выніку Саўміну нічога не застаецца, як пайсьці на ўвядзеньне ўласнай валюты. Але калі ў Доме ўраду будзе заставацца цяперашні некваліфікаваны кабінэт, то марна спадзявацца, што нехта дасьць Беларусі крэдыты для стабілізацыі нацыянальнай грашовай сыстэмы. А ў Кебіча быў шанец (сёлета ўвесну) стварыць трывалую беларускую валюту. Але ён чамусьці зь дзіўнай упартасьцю заўсёды ставіць не на таго каня. У гэтым выпадку, праўда, то была кабыла — «рублёвая зона» з Чарнамырдзіным наверсе.

**Віталь МАЛАШКА,**
**народны дэпутат Рэспублікі Беларусь (фракцыя БСДГ)**

# Чалавек са стрэльбай

**Усім нешта перапала ад былога Савецкага Саюзу. Каму Крэмль, каму касмадром, каму атамная электрастанцыя, а Беларусі — немалы кавалак ваеннага пірага.**

Адных танкаў на кожнага чалавека, улічваючы немаўлятаў, Беларусь мае больш за любую іншую дзяржаву. Толькі па дамове аб скарачэньні звычайных узбраеньняў у Эўропе нам належыць зьліквідаваць у 1,7 раза больш зброі за ЗША, у 10 разоў больш за Велікабрытанію, у 50 — за Францыю. Праблема! Але я хачу сказаць не пра ваеннае жалеза, а пра тых людзей, якія да нядаўняга часу былі схаваныя пад бранёю. Сучасныя рэаліі адбіліся на іх ня менш жорстка, чым на цывільным насельніцтве. У гэтым сэнсе сапраўды «народ і партыя — адзіныя».

Яшчэ Антон Чэхаў казаў: «Калі ў першай дзеі на сьцяне вісіць стрэльба, то ў другой яна павінна абавязкова стрэліць». Расейскае войска распачало страляніну па ўсіх франтах: унутраным — па чорна-белым Доме і зьнешніх — па пэрымэтры расейскіх межаў. Беларускае «ружжо» вісіць пакуль што на сьцяне. Калі яно стрэліць? І ці варта гэтага чакаць?

Што да мяне, то я б навогул прапанаваў у пэрспэктыве зьліквідаваць уласнае войска. Папярэдне, вядома, заключыўшы пагадненьні з суседзямі пра гаранты тэрытарыяльнага адзінства Беларусі і недатыкальнасьці яе межаў. Варта пакінуць толькі памежныя войскі і часткі ўнутраных войскаў, неабходныя для падтрыманьня спакою грамадзянаў. Магчыма, патрэбна атрымаць адпаведныя гарантыі і ад вядучых дзяржаваў сьвету, і такіх міжнародных арганізацыяў, як НАТО і ААН. Такая сыстэма міжнародных проціваг аў абараняла б беларускі сувэрэнітэт куды больш надзейна за тое войска, якое мы можам дазволіць сабе трымаць.

Але гэта толькі маё бачаньне будучыні, а пакуль што праблема чалавека са стрэльбай на Беларусі застаецца.

Прыбалтыйскага варыянту — чужое войска сыходзіць, сваё ствараем — на Беларусі не атрымалася. Сваё войска стваралася мэханічным шляхам, праз зьмену шыльды: замест штабу акругі — міністэрства абароны. Ягоны галоўны ўваход, як і раней, у прамым і пераносным сэнсе выходзіць на вул.Камуністычную.

Але памыляюцца тыя, хто лічыць, што цяперашняе вайсковае жыцьцё абмяжоўваецца толькі фінансава-эканамічнымі афёрамі вайсковых чыноўнікаў рознага рангу і пэрманентным паляваньнем на ведзьмаў у асобе Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў. Не ўсё так проста. На нашых вачах прагрэсуе хвароба складанага вайсковага арганізму. Ён быў хворы і ўчора. Але тады ён быў змацаваны дастаткова трывалымі абручамі. Цяпер жа, калі абручы зваліліся, — бочка рассыпалася. І калі хваробу не спыніць — стрэльба стрэліць.

Як рыдлёўка іржавее без ужываньня, так войска гніе без вайны. Вайсковец — гэта чалавек, які ўсклаў на сябе абавязак памерці тады і там, дзе яму загадаюць. І гэта не цынізм, а зьмест вайсковага рамяства. Амэрыканцы, ангельцы, французы пэрыядычна даюць сваім вайскоўцам магчымасьць паказаць моц цягліцаў. Фолкленды, Чад, Пэрсыдзкая затока, Самалі — колькасьць гэтых прыкладаў можна множыць. Нават Нямеччына і Японія, якім, здаецца, паражэньне ў сусьветнай вайне павінна было назаўсёды адбіць ахвоту да ваенных гульняў, нядаўна амаль адначасова распачалі практыку скарыстаньня сваіх войскаў за мяжою.

Наша «непераможнае і легендарнае» чырвона-савецкае войска праз усе часы мела магчымасць ваенных практыкаваньняў, не стамляючыся змагацца за мір у розных рэгіёнах сьвету. Зусім нядаўна гэта сарамліва называлі «выкананьне інтэрнацыянальнага абавязку». Сёньня батальёны Расеі ды Украіны ў складзе войскаў ААН у былой Югаславіі. А мы?

Дарэчы, кожную звышдзяржаву лёгка абвінаваціць ва ўзмацненьні сваёй вайсковай прысутнасьці ў тым ці іншым рэгіёне сьвету. І гэта праўда, бо такія дзеяньні гігантаў сапраўды могуць парушыць сусьветны балянс сілаў. Аднак Беларусі такое абвінавачваньне не пагражае: ня тая краіна — ня тыя маштабы.

Дык гэта ж гандаль «гарматным мясам», скажуць мне. Гэта — амаральна. Выбачайцё — ці не яшчэ амаральней утрымліваць такое войска, якое Беларусь ані палітычна, ані эканамічна, дэмаграфічна, экалягічна і г.д. проста ня мае змогі ўтрымліваць. Больш за тое, войска мае мажлівасьць утрымліваць само сябе. І не праз часовыя захады, накшталт распродажу маёмасьці — яна ўрэшце некалі скончыцца, а праз тыя, што сапраўды дазваляюць вайскоўцам рабіць справу, якой яны вырашылі прысьвяціць свае жыцьці.

Дык што, можа аўтар за сьлёзы беларускіх мацярок і за хаўтуры ў беларускіх хатах? Не, ані не так. Пахавальных абвестак шмат ідзе і зь мірных беларускіх гарнізонаў. Але чым больш прафэсыйным будзе войска, тым менш іх будзе. А навучыцца вайсковаму майстэрству, не нюхнуўшы як сьлед пораху, гэта, даруйце, тое самае, што вучыцца плаваць у басэйне без вады. І яшчэ: кантрактовая сыстэма і прынцып абсалютнай добраахвотнасьці — дастатковыя захады, каб запабегнуць абвінавачваньняў у загадзя заплянаваным забойстве.

Калі мы сапраўды хочам стаць паўнапраўным суб'ектам сусьветнай супольнасьці, то маем права скарыстаць і з такога чыньніка, як беларускае войска.

Мае нататкі амаль ня месьцаць лічбаў. Аднак усё, пра што я пішу, можна палічыць з алоўкам у руках. Для гэтага трэба адно дзьве рэчы: жаданьне і палітычная воля. Першага мы маем дастаткова, а вось другога на Беларусі значна бракуе.

**Андрэй КІШТЫМАЎ**



*Здымак Сяргея БРУШЧКО*

## Сёньня

**Сяргей ДУБАВЕЦ**

# «ТРЕНИЕ И ИЗНОС»

Некалькі хірургічных параўнаньняў.

Беларуская незалежнасьць нагадвае ампутацыю. Паміж дзьвюма, скажам так, сапраўднымі краінамі, суб'ектамі міжнароднага жыцьця, заўсёды ёсьць спрэчныя тэрыторыі, якія на працягу стагодзьдзяў пераходзяць то да аднаго суб'екту, то да другога. Яны, гэтыя тэрыторыі, як бы муляюцца, соўгаюцца, шаруюцца. Ад гэтага соўганьня паміж дзьвюма краінамі зьяўляецца нейкае трэцяе цела. Калі ў целе выяўляецца суб'ект, гэта значыць свая ўнутраная лёгіка разьвіцьця, яно вылучаецца ў самастойную краіну. Калі ж лёгікі няма, тады набыцьцё незалежнасьці якраз і нагадвае ампутацыю.

Паўстаньне суб'екта, тае ўнутранае лёгікі, адбываецца на падставе пэўнага прыярытэту — альбо гэта прыярытэт асобы, альбо прыярытэт прынцыпу.

Пакуль на Беларусі ня выявілася ні першае, ні другое. Магчымы выбар будзе залежаць ад таго, хто прыйдзе да ўлады над нашай бязь меры канфармісцкай краінай. А прыйдзе альбо стопрацэнтовы нацыянал — і тады гэта будзе сапраўдная краіна, альбо абласьнік — і гэта будзе адна з расейскіх губэрняў. Любы трэці толькі зацягне пераходны пэрыяд.

Старшыня саўміну — хутчэй абласьнік. Як незалежнік ён мог бы разьлічваць на сьцьверджаньне прыярытэту асобы. Старшыня Вярхоўнага Савету — хутчэй незалежнік, але гаворыць пра першынство закону, сьцьвярджаючы тым самым прыярытэт абсурду. Кіравацца сучасным заканадаўствам РБ — тое самае, што кіравацца ПСС Леніна ці казкамі Шахерэзады. Любое выйсьце тут можа быць толькі процізаконнае. Бо гутарка ідзе пра злом старога ладу — значыць, старога закону. На тое — прыклад Расеі.

Прыярытэт прынцыпу сьцьвярджаецца моцнай палітычнай сілай (такой, як некалі «Саюдзіс» у Літве) або праз агульнанацыянальны ўздым. А паколькі ў нас гэтага няма, то на Беларусі суб'ект хутчэй за ўсё выявіцца праз асобу. Асоба тутэйшага чалавека мусіць злучыць парваную лёгіку разьвіцьця гэтага краю й народу зь мінуўшчыны ў будучыню. Тады дзеяньні асобы будуць адэкватныя гэтай лёгіцы, якімі б дзіўнымі й «антызаконнымі» яны ні былі. І толькі тады можна будзе ствараць законы гэтага суб'екту, што значыць — сьцьвярджаць уласныя чалавечыя й нацыянальныя прынцыпы Беларусі.

Сёньня стыхія нябыту адразу ж вяртаецца на тое месца, дзе скончылася актыўнасьць БНФ. Усе гэтыя канфэдэрацыі з Расеяй, адзіная рублёвая зона, мафіёзныя забойствы — гэта сама ў сабе несьвядомая стыхія багны, якая ў прынцыпе ня здатная да суб'ектнага дзеяньня. Адзіны магчымы «дыялёг» зь ёю — гэта дрэнаж.

Пачаўшы свае нататкі з соўганьня й думаючы пра тое, чым яно скончыцца, я згадваю назву колішняга ўсесаюзнага навуковага часопіса, які выдаваўся менавіта ў Менску — «Трение и износ». Здаецца, у падпісным каталёгу гэта быў самы дарагі часопіс. Калі спрэчная тэрыторыя не набывае ўнутранае лёгікі, яна нагадвае мазоль, які пастунова набухае ў крывавую бурбалку і — лопаецца ў нішто.



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Бітва пад Леніна: што думаюць пра гэта ў Польшчы?

**50 гадоў мінула з таго часу, як 1-ая польская дывізыя імя Тадэвуша Касьцюшкі была кінутая ў бой каля мястэчка Леніна, што ў Горацкім раёне, і панесла там значныя страты. Ці не было гэта сьвядомым зьнішчэньнем польскай дывізыі? — гэтае пытаньне апошнім часам усё часьцей паўстае ў Польшчы.**

Адразу пасьля няўдачы камандзір дывізыі генэрал Бэрлінг напісаў рапарт, у якім тлумачыў усё, па-першае, змучанасьцю польскіх жаўнэраў маршам, а па-другое — няздольнасьцю савецкага камандаваньня падтрымаць палякаў авіяцыяй і артылерыяй. У сваю чаргу генэрал Гордаў — камандуючы 33-яй арміяй, у складзе якой была польская вайсковая адзінка, — абвінаваціў палякаў у няздольнасьці ваяваць і масавым дэзэрцірстве. 652 польскія жаўнэры загінулі, больш за 100 трапіла ў палон, што разам склала 10% ад усяе дывізыі. Акрамя таго, было яшчэ болей за 1000 параненых.

Касьцюшкаўцы шчыра хацелі змаганьня з гітлераўцамі. Яшчэ ў жніўні 1943 г. генэрал Берлінг і Ванда Васілеўская зьвярнуліся да Сталіна з просьбаю, каб ён кінуў палякаў у бой 1 верасьня, ва ўгодкі 2-й сусьветнай вайны. Аднак адбылося гэта толькі ў канцы кастрычніка, калі бітва ня мела аніякага стратэгічнага сэнсу. Сёньня польскія вайсковыя гісторыкі называюць некалькі прычынаў паразы касьцюшкаўцаў пад Леніна. Па-першае, Хоць Сталін і ня мог быць асабіста зацікаўленым у іхняй паразе, у Чырвонай арміі, адрозна ад Войска Польскага, папросту ніколі не цанілі жыцьцё жаўнэра. Напрыклад, пад Монтэ-Касына (Італія) другі польскі корпус, якім камандаваў генэрал Андэрс, вядучы цяжкія баі, панёс у тры разы меншыя страты, чым яны былі пад Леніна. А дывізыяй імя Касьцюшкі кіравалі тыповыя савецкія афіцэры, хоць і палякі па нацыянальнасьці. Па-другое, у складзе дывізыі былі жаўнэры, якія толькі што выйшлі са сталінскіх лягераў, жаўнэры, што ўведалі праўду пра Катынь, якую якраз тады абнародавалі немцы. Зразумела, што змагацца на баку Сталіна асаблівага энтузіязму яны ня мелі. І апошняе. 42-ая і 290-ая савецкія дывізыі, што стаялі на флангах дывізыі Касьцюшкі, былі змучаныя баямі і мелі толькі дзьве трэці свайго складу. Яны не маглі эфэктыўна падтрымаць палякаў у баі. Але, бадай, апошняя прычына наймeнш істотная, бо нават пазьней, ужо пры вызваленьні Польшчы, 1-ая Польская армія генэрала Бэрлінга па-ранейшаму цярпела вялікія страты.

Значэньне бітвы пад Леніна хіба толькі ў тым, што інтарэсам Сталіна паслужыла і кроў польскага жаўнэра.

**Сяргей МАКСІМОВІЧ**

# Беларусь: краіна саветаў і злосных памежнікаў

**Такое ўражаньне засталося ў карэспандэнта польскай «Rzeczypospolitej» ад наведаньня нашае краіны.**

Беларусь — краіна, геаграфічна блізкая і да Летувы, і да Польшчы, з вельмі падобнай прыродай, але з такой непадобнай да суседзяў сытуацыяй і спосабам яе калектыўнага перажываньня.

На Беларусі не было ні заваёваў «Салідарнасьці», ні вялікіх агульнанацыянальных уздымаў кшталту прыняцьця ў Летуве дэкларацыі аб сувэрэнітэце ў лютым 1991 г. хоць Беларусь стала незалежнай дзяржавай, гэтае здарэньне міжнароднай важнасьці не ўкаранілася яшчэ дастаткова добра ў грамадзкай сьвядомасьці.

Вялікі Пачатак надышоў, але — ні перад гэтым, ні пасьля — не наступіў сапраўдны канец папярэдняе эпохі. Не адбылося канчатковага разьвітаньня з савецкім мінулым, не было нават самай маленькай палітычнай паводкі, пасьля якой мог бы ўзьняцца новы грунт. Доўгачаканая перамена набыла выгляд ...адлігі. У выніку Беларусь абнавілася, але сыстэма засталася ранейшая. А стары апарат па-ранейшаму стаіць на варце гэтае сыстэмы. Кажучы так, я не хачу сьцьвярджаць, што тут сапраўды нічога не зьмянілася. Зьмянілася даволі шмат. Гэта можна параўнаць з польскім Кастрычнікам'56. Нельга недаацэньваць гэтых зьменаў, але трэба на іх глядзець рэальна ўва ўсіх вымярэньнях — эканамічным, сацыяльным, палітычным і культурным.

Пачнем з эканомікі: што азначае сьцьвярджэньне, быццам Беларусь бедная? Статыстычны беларус значна багацейшы за статыстычнага расейца, ён не галадае, а толькі трохі недаядае. Зрэшты, гэта залежыць у значнай ступені ад рэгіёну. Даваенная польска-савецкая мяжа ўсё яшчэ кідаецца ў вочы: на захад ад яе сетка паселішчаў больш густая, там болей дарогаў, можна часьцей натрапіць на добра збудаваныя дамы. Наступным такім цывілізацыйна-гаспадарчым бар'ерам зьяўляецца мяжа паміж Беларусьсю і Расеяй.

Адной з найважнейшых зьменаў сталася тое, што людзі перасталі баяцца найгоршага. Абмежаваньне паліцэйскае ўлады не азначае, аднак, аўтаматычнага захаваньня правапарадку і грамадзянскіх свабодаў, хоць і ёсьць першым крокам у гэтым кірунку. Паліханы дзесяткамі гадоў беларускі жыхар няздольны катэгарычна дамагацца захаваньня сваіх правоў і шанаваньня годнасьці. Зараз ён аж занадта пакорлівы. Асабліва добра гэта відаць пры перасячэньні дзяржаўнае мяжы. Беларускія памежнікі і мытнікі паводзяць сябе выключна зьдзекліва, яны груба прыніжаюць сваіх землякоў, а тыя ўвогуле на гэта не рэагуюць і прымаюць такія паводзіны за цалкам натуральную рэч. Ці доўга яшчэ будзе працягвацца гэтая брыдкая анамалія?

*(Rzeczpospolita)*

## Яшчэ адзін памежны пераход

**Новы пераход паміж Польшчаю і Летувою ўсталяваны ў Будзіска-Кальварыі. Неўзабаве ён стане найбуйнейшым і найсучасьнейшым на польскай усходняй мяжы.**

Пераход уяўляе сабою элемент магістралі Via Baltica, што злучае краіны Балтыі з Заходняй Эўропаю. Будаўніцтва пераходу закончыцца ў наступным годзе, тады праз яго змогуць мінаць мяжу аўтамабілісты. Кошт праекту — 150—160 млрд. злотых. Прапускная здольнасьць пераходу з мытным даглядам — 5 тыс. легкавых і 1 тыс. грузавых машын за суткі.

# Ці праспалі палякі «смуту»?

Tygodnik Powszechny пра ўсходнюю палітыку Польшчы

Перамога дэмакратыі ў Расеі ў жніўні 1991 г. мела для Польшчы фундамэнтальнае значэньне: яна зьліквідавала маналіт, які існаваў дагэтуль за нашай усходняй мяжою. Адсутнасьць такога маналіту — зьява новая, бо падчас папярэдняй «смуты» 1917 году з-пад расейскае ўлады здолелі вызваліцца — апрача Польшчы — толькі Фінляндыя, Летува, Латвія і Эстонія. Незалежная Украіна, якая будавала тады сваю дзяржаўнасьць, хістаючыся ад адной арыентацыі да другой, пратрымалася ў найлепшым выпадку два з паловай гады, тым часам як незалежная Беларусь па сутнасьці ня здолела паўстаць. Толькі сёньня абедзьве гэтыя дзяржавы сапраўды зьявіліся, і гэта адбылося, па першае — мірным шляхам, а па другое — праз узаемнае прызнаньне свайго асобнага існаваньня. Абедзьве згаданыя акалічнасьці, як падаецца, павінны гарантаваць трываласьць гэтае зьявы. Маштаб зьменаў сапраўды ўражвае, бо палітычнае мазаікі на Усходзе мы ня бачылі пяцьсот гадоў — з таго часу як Іван Жахлівы распачаў «зьбіраньне земляў рускіх».

Цяперашняя «смута» характарызуецца развалам былой імпэрыі на некалькіх узроўнях. Першы ўзровень зьявіўся ў сьнежні 1991 г., калі мейсца СССР заняла цалкам свабодная і добраахвотная Садружнасьць са сталіцай у беларускім Менску. Другі ўзровень пазначыўся тады, калі выявілася, што па-за межамі СНД засталіся ўсе тры балтыйскія краіны (Летува, Латвія і Эстонія), дзьве закаўказкія рэспублікі (Грузія ды Азэрбайджан), а таксама адна сярэднеэўрапейская рэспубліка, якая, аднак, жыве ўспамінамі пра «Вялікую Румынію» — Малдова. Поруч гэтых двух макраўзроўняў зьявіўся яшчэ й мікраўзровень, г.зн. унутраны раскол паасобных рэспублік. У самой Расеі адасобіліся дзьве аўтаномныя рэспублікі, разьмешчаныя на ўскрайку дзяржавы (Чачня і Тува), а таксама адна ў самым цэнтры (Татарстан).

Але гэтым не абмяжоўваецца карціна расейскіх зьменаў і разбурэньня. Новыя незалежныя рэспублікі набываюць новыя геапалітычныя арыентацыі. «Прыбалтыка» схіляецца ў бок Скандынавіі, Беларусь і Украіна наблізіліся да Польшчы, Грузія выбрала ня надта добра акрэсьлены «празаходні» накірунак, Азэрбайджан стаў арэнай змаганьня Ірану ды Турцыі, Таджыкістан трапіў пад уплыў муджахедынаў з суседняга Афганістану.

Аднак, нягледзячы на ўсе радыкальныя зьмены на Усходзе, польская палітыка пасьпяхова перажыла чарговую «смуту» — магчыма таму, што рэалізацыя гэтай палітыкі пачалася яшчэ з часоў існаваньня СССР, калі за ўсходняй мяжой сытуацыя была даволі стабільная. Польская вонкавая палітыка, аўтарам якой з самага пачатку быў Кшыштаф Скубішэўскі, грунтавалася на дактрыне «двукалейнасьці», г.зн. падтрыманьня паралельных кантактаў як з савецкім цэнтрам, так і з рэспублікамі, што станавіліся на шлях незалежнасьці. Амаль праз год пасьля афіцыйнага візыту ў Маскву прэм'ера Тадэвуша Мазавецкага Скубішэўскі наведаў у красавіку 1990 г. — як падавалася ў афіцыйнай заяве — Савецкі Саюз, Расею, Украіну і Беларусь. Такое вычляненьне, прадэманстраванае тады польскім бокам упершыню, сталася мажлівым у выніку прынятых раней (з маўклівай згоды Міхаіла Гарбачова) дэкляарацый аб сувэрэнітэце бальшыні з памянёных рэспублік.

Заваяваўшы прыхільнасьць Крамля, Польшча актыўна дзейнічала на карысьць далейшага разьняволеньня рэспублік. Пасьля абвяшчэньня сувэрэнітэту балтыйскімі рэспублікамі урад Бялецкага ў жніўні 1991 г. прызнаў незалежнасьць Летувы, Латвіі і Эстоніі. Калі ж і Украіна прыняла адпаведную дэклярацыю, Польшча стала першай дзяржавай сьвету, якая прызнала існаваньне вольнае Украіны. Як бачым, «двукалейнасьць» польскае палітыкі характарызавалася пасьлядоўнасьцю, абачлівасьцю і багатым уяўленьнем. Яна рабіла стаўку на дэзынтэграцыю, але не на дэстабілізацыю.

Гэтую лінію ў прынцыпе захаваў і паўсталы пасьля першых вольных выбараў урад Альшэўскага, хоць гэта было ня так лёгка. Адным зь першых рашэньняў новага кабінэту было прызнаньне 27 сьнежня 1991 г. незалежнай Беларусі і адкрыцьцё беларускае амбасады ў Варшаве як першай дыпляматычнай установы гэтай дзяржавы ў сьвеце. Дуэт Альшэўскі-Скубішэўскі разумеў тады ідэю двукалейнасьці як палітыку роўнае дыстанцыі і ад Расеі, і ад рэспублік, што зьяўляюцца гістарычнымі суседзямі Польшчы. Далёкасяжныя прапановы беларускага прэм'ера Вячаслава Кебіча, якія ён зрабіў Альшэўскаму ў сакавіку 1992г. у Белавежскай пушчы, сустрэліся хутчэй са стрыманай рэакцыяй, бо польскі бок браў пад увагу свае магчымасьці, найперш эканамічнага характару.

Менавіта ў гэты пэрыяд актыўнасьць Польшчы на абшары «міжмор'я» пачала выклікаць незадаволенасьць Расеі. Першы ўсходні візыт Ганны Сухоцкай (у Менск у лістападзе 1992 г.) выклікаў гнеўную рэакцыю праельцынскіх «Известий». Праз два месяцы Сухоцка наведала Кіеў: гэтым разам яна была абачлівейшая ў выказваньнях, затое больш канкрэтная ў дзеяньнях. Якраз тады было заяўлена пра стварэньне каардынацыйнага камітэту прэзыдэнтаў Украіны і Польшчы — адзінай «гарачай лініі» такога тыпу, што злучае сёньня Варшаву зь якой-колечы сталіцай на Усходзе.



Дапаўненьнем міждзяржаўных дамоваў сталі вайсковыя пагадненьні, дасягнутыя ў 1992-93 гг. з усімі суседзямі Польшчы. Апошняе ў шэрагу гэтых дамоваў падпісаў з Расеяй 7 ліпеня 1993 г. міністр Януш Анышкевіч, пераконваючы яе ў тым, што Польшча мае толькі мірныя ды сяброўскія намеры. Прысутнасьць Расеі ў польскім мысьленьні пра Усход — Расеі, якую разглядаюць не як традыцыйнага ворага, а як партнэра — стала часткай палітыкі ўраду Сухоцкай у адрозьненьне ад кабінэту Альшэўскага. Менавіта дзякуючы гэтаму польская «жалезная лэдзі» здолела супакоіць Расею і адначасна прывучыць яе да польскае актыўнасьці на Усходзе.

У апошнія чатыры гады польская ўсходняя палітыка праводзілася сапраўды па-майстэрску. Аднак заўсёды застаюцца фундамэнтальныя пытаньні: якімі сіламі можа Польшча рэалізоўваць доўгатэрміновую ўсходнюю палітыку? На чыю дапамогу можа разьлічваць? На працягу апошніх двух гадоў Польшча была амаль што «паслом» Украіны і Беларусі ў сьвеце, але гэта практычна не прынесла ніякіх вынікаў. Польшча таксама шмат зрабіла, каб паспрыяць цэнтрабежным рухам на Усходзе, але гэты працэс затрымаўся сам, дэманструючы новае аблічча — вельмі часта рашуча прарасейскае. Ці можна было зрабіць больш? Глыбейшае заангажаваньне Польшчы на Усходзе прывяло б да канфрантацыі няроўных сілаў і зрабіла б рэальнай рызыку расейскае помсты — няважна, вайсковай ці эканамічнай або нават толькі дыпляматычнай. Апрача таго, хоць сёньняшняя расейская дэмакратыя нагадвае часам фігавы лісток, які прыкрывае імпэрыялізм, гэта можа быць першым урокам свабоды ў змрочнай расейскай гісторыі. Вынікам актыўнае ўсходняе палітыкі магло б стаць толькі адраджэньне расейскага аўтарытарызму.

Такім чынам, на сёньняшні дзень няма альтэрнатывы для палітыкі роўнае дыстанцыі, бо толькі яна здольная падтрымліваць раўнавагу сілаў у рэгіёне. Таму, што б мы ні казалі цяпер пра неабходнасьць неўмяшаньня ў зону расейскіх інтарэсаў, мы павінны памятаць, што выпрабаваньнем для расейскае дэмакратыі ёсьць цяпер і так вольныя і незалежныя Украіна і Беларусь. І калі мы робім стаўку на Расею — дык толькі на Расею дэмакратычную, а калі мы робім стаўку на дэмакратычную Расею — дык гэтым самым мы робім стаўку таксама й на Украіну ды Беларусь.

**Анджэй РАМАНОЎСКІ**
*(Tygodnik Powszechny)*
Друкуецца са скарачэньнямі



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## НАША НІВА №16

**Выйшаў з друку чарговы нумар беларускай віленскай газэты НАША НІВА. Нумар разьбіты на тры тэматычныя блёкі.**

**Свае праблемы** на Беларусі (яцьвяжскі сэпаратызм, ацэнка дзейнасьці Арміі Краёвай) пакуль што рупяць менш, чым чужыя й агульныя. Але ад гэтага яны не зьнікаюць. Ацэнцы дзейнасьці Вацлава Іваноўскага прысьвечаны артыкул Яна Жамойціна з Варшавы. Павал Церашковіч прысьвяціў свой артыкул этнічным праблемам Паўднёва-Заходняе Беларусі.

**У кожнага народу ёсьць свае тыповыя рысы,** якія праяўляюцца ў агульных характарыстыках, — сьцьвярджае М.Бронскі з парыжскае «Kultury». А ў масавай культуры гэтыя адметнасьці адлюстроўваюцца праз сьмех, сілу, сэкс, яркім прыкладам тут ёсьць Супэрмэн, якому сёлета спаўняецца 60 гадоў, за якія ён стаў героем амэрыканскай міталёгіі. Пра гэта нагадвае А.Сіюль.

**«Людзьмі звацца...»** Трансфармацыя лёзунгаў і беларуская мара інтэрпрэтуюцца А.Кебікам. Фаварыт францускае моладзі Барыс Віян — госьць «НН» №16, а таксама актор Юзас Будрайціс.

Фірма ЧМЕЛЬ

Гуртовы і раздробны гандаль

Шырокі выбар тавараў

тэл. (0172) 61-55-77

# З-за адсутнасьці бэнзыну Горадня ледзь не атрымала бронзавы помнік у шынялі

Надышоў час, калі нашая незалежная дзяржава вырашыла паставіць на гарадзкіх пляцах, акрамя Леніна ў розных, але аднолькава брыдкіх мадыфікацыях, і помнікі сваім паэтам. Што з гэтага атрымліваецца і як гэта робіцца, паказвае прыклад з праектам помніка Максіму Багдановічу ў Горадні.

Нядаўна са сталіцы да нас завітала прадстаўнічае журы, у складзе якога былі ляўрэат Ленінскай і некалькі ляўрэатаў Дзяржаўных прэміяў. Яны спрабавалі прымусіць нас узяць ад іх няякасны тавар, як кажуць расейцы «нате вам на лопате». Кіраваў акцыяй вядомы спадар Уродніч зь Міністэрства культуры. У Новым замку, дзе некалі быў абкам КПБ, а сёньня месьціцца экспазыцыя гісторыка-археалягічнага музэя, выставілі чатыры праекты помніка: два гарадзенскіх аўтараў і два — менскіх. Запрасілі на абмеркаваньне гарадзенцаў, розных зацікаўленых асобаў. Што з гэтага атрымалася — мяркуйце самі.

Сп.Уродніч паскардзіўся на тое, што дзяржава выдаткоўвае вялікія грошы на арганізацыю конкурсаў, а толку мала альбо зусім няма. У Менску, напрыклад, праведзена ажно чатыры туры конкурсу на лепшы помнік Скарыну. Падтэкст быў такі: «давайце, хлопцы, хоць у Горадні ня будзем з Багдановічам цягнуць, а паставім тое, што ёсьць».

Тады сакратар мясцовай мастакоўскай арганізацыі сп.Лук'янаў пацікавіўся: «А чаму журы праігнаравала думку саміх гарадзенцаў? Гарвыканкам жа накіраваў ліст у Міністэрства культуры з просьбаю, каб праект быў абмеркаваны ў Горадні.» Абласное адзьдзяленьне Саюзу мастакоў прапанавала, каб журы ў поўным складзе сабралася менавіта над Нёмнам. Горад зацікаўлены атрымаць сапраўдны помнік, а не яшчэ аднаго Леніна, толькі Максіма.

На гэта сп.Уродніч крыху пакрыўджана патлумачыў, што паседжаньне журы ўжо адбылося, кворум быў, рашэньне прынята, прычым канчатковае. Сяброў журы з Горадні таксама запрашалі, але ніхто не прыехаў, бо не было бэнзыну. У сваю чаргу сталічнікі таксама ня мелі тады паліва, каб выехаць у Горадню. Атрымлівалася, што гарадзенцаў сабралі ў новым замку зусім ня дзеля таго, каб параіцца зь імі, а толькі каб паведаміць сваю волю, што і пацьвердзіў сп.Уродніч.

Дырэктарка гарадзенскага музэя М.Багдановіча паэтка Данута Бічэль-Загнетава запярэчыла менскаму чыноўніку: «Сёньня ўжо іншыя часы, але нам усё адно спрабуюць навязаць гэткі «соцрэалістычны шэдэўр», паўз які мы будзем вымушаныя хадзіць усё жыцьцё». Рэч у тым, што абодва сталічныя праекты помніка былі раней забракаваныя, але журы раптам адзін з забракаваных ухваліла.

Сп.Уродніч, аднак, пачаў ёй па-мэнтарску тлумачыць, што гэта яе прыватная, суб'ектыўная думка, а наконт соцрэалізму можна яшчэ паспрачацца. Маўляў, вырашалі ляўрэаты высокіх прэміяў, а яны сваю справу ведаюць адмыслова. У гэты момант усе прысутныя гарадзенцы адчулі абсурднасьць сытуацыі і сваю бяздаднасьць: калі раней была Масква, зь якой нельга было спрачацца, дык цяпер яе замяніў Менск, які таксама ня церпіць пярэчаньняў.

Скажу тут колькі словаў пра абодва шэдэўры сталічнікаў. Адзін зь іх уяўляе такую кампазыцыю: Багдановіч стаіць у шынялі, у якім рэльефна вылеплены кожны гузік, побач з аркаю вакна, над якой птушкаю ўскрылілася фіранка. Гэты праект прыстасаваны да Дома-музэя паэта. Другі ж ухвалены меліся паставіць непадалёку ў парку. Багдановіч тут таксама ў абавязковым шынялі. Адметнасьць у тым, што паэт непрапарцыйна высокі, выцягнуты, відаць, каб перадаць ягонае памкненьне да зораў. За сьпінаю ў яго вялізная ліра ў выглядзе крылаў Пэгаса. Сталічнікі гэты помнік прагнулі паставіць сярод парка Тызенгаўза, тым самым быле б разбурана кампазыцыйнае асяродзьдзе Гарадніцы — гарадзкога кварталу XVIII ст., а таксама перакрэсьлены той плян рэканструкцыі старога паркава-палацавага ансамблю, над якім сёньня працуюць гарадзенскія спэцыялісты.

Ня ведаю, што здарылася, але раптам усе гарадзенцы, і нават чыноўнікі, абурыліся, што вельмі паўзьдзейнічала на самога сп.Уродніча. Ён тут жа перамяніў тон: маўляў, ён сам цяпер толькі зразумеў недарэчнасьць сытуацыі. Гарадзенская інтэлігенцыя пакрыўдзілася, але ж ёй ніхто нічога не навязвае, як-ніяк гарадзенцы — заказчыкі помніка, яго гаспадары і г.д.

Сталічныя члены журы, якія перад гэтым выступалі зь вялікай пыхаю, ня церпячы пярэчаньняў, таксама зьмянілі галасы і пачалі апраўдвацца, што ніякіх махінацыяў з ухваленым праектам не было, што яны ня ведалі мэты паездкі, але згадзіліся ехаць, бо ім... вельмі падабаецца наш старажытны горад. Урэшце журы вымушана было пагадзіцца на правядзеньне яшчэ аднаго туру конкурсу.

Усьлед за помнікам Каліноўскаму, ні адзін з чатырох праектаў якога не наважыліся нават прывезьці ў Горадню, гарадзенцам давядзецца яшчэ няпэўны час чакаць і помніка Максіму. Але лепш пачакаць, пакуль сапраўдныя беларускія скульптары пачнуць ствараць манументальныя вобразы сапраўды беларускіх паэтаў, чымся пагаджацца абы на што.

А пакуль у Горадні застаюцца тры заўважныя помнікі: адзін выдатны, за польскага часу, — бюст Элізе Ажэшцы, а таксама два савецкія — пяцімэтровы азгураўскі Ленін і танк Т-34 у адзіным суседзтве з гмахам новага тэатра і бэрнардынскім касьцёлам.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**

# † Сьветлай памяці Сяргея Карніловіча



**29 кастрычніка ў Кліўлендзе (ЗША) на 64-ым годзе жыцьця раптоўна памёр Сяргей Карніловіч — вядомы дзеяч беларускай эміграцыі, які быў прадстаўніком нашае газэты ў Злучаных Штатах.**

**Сяргей Карніловіч нарадзіўся ў вёсцы Таргуны Докшыцкага раёна. У 1942 г. дзіцем быў вывезены ў Нямеччыну. Пазьней трапіў у ЗША, жыў і працаваў у невялікім амэрыканскім горадзе Кліўленд, дзе ўтварыўся ладны асяродак беларускай эміграцыі. У многім дзякуючы намаганьням Сяргея Карніловіча ў Кліўлендзе быў створаны беларускі грамадзка-культурны цэнтар «Полацак». Апошнім часам сп.Карніловіч многа сілаў і часу аддаваў дабрачыннай дзейнасьці на карысьць пацярпелых ад Чарнобыльскай навалы.**

**Рэдакцыя газэты СВАБОДА смуткуе з прычыны заўчаснай сьмерці Сяргея Карніловіча і выказвае спачуваньне сваякам і блізкім нябожчыка.**

**Сяргей Карніловіч пахаваны 2 лістапада на беларускіх могілках у Кліўлендзе. На пахаваньні прысутнічалі міністр замежных справаў Беларусі П.Краўчанка, пастаянны прадстаўнік у ААН Г.Бураўкін, прэзыдэнт Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня А.Шукелойць.**

## Не забі бліжняга...

**Нават у духоўнай сэмінарыі пачалі высьвятляць адносіны з дапамогаю нажа.**

Сапраўды кажуць — шляхі божыя неспазнаныя. Што на самой справе не падзялілі паміж сабою два сэмінарысты духоўнай сэмінарыі, што ў Жыровіцах, каля Слоніма, даznаюцца сьледчыя. Аднак так здарылася, што будучыя служкі Божыя вырашылі высьветліць адносіны між сабою «як сапраўдныя мужчыны» і выйшлі на манастырскі падворак сам-насам. І адзін з байцоў у чорнай расе, нядоўга думаючы, усадзіў сваймy аднакурсьніку ў жывот нож. Дзякуй Богу, бойка скончылася не сьмяротным зыходам, а ўсяго толькі ложкам у шпіталі.

Трэба думаць, што царкоўная кар'ера для гэтых хлопцаў закончылася.

**В.ВАЛАДАШЧУК**

## Унівэрсытэт гасьцінна сустракае нудыстаў

**22 кастрычніка Менскі Лінгвістычны Унівэрсытэт (былы Інстытут замежных моваў) шакіравала наступная вестка: падчас першай пары па сходах аднога з карпусоў бегаў... голы студэнт.**

На ім, як кажуць відавочцы, не было нават шкарпэтак. Гавораць таксама, што «галяк» моцна напалохаў некалькіх дзяўчат, якія, відаць, да гэтага інцыдэнту спадзяваліся, што родная alma mater зьяўляецца зонай, свабоднай ад «маньякаў». На жаль, мы ня маем інфармацыі наконт далейшага лёсу наваяўленага нудыста. Невядома таксама, што падштурхнула гаротнага студэнта на такі радыкальны крок. Адныя кажуць, што ён такім чынам выказваў пратэст супраць мізэрных стыпэндыяў, іншыя мяркуюць, што ён проста сьвяткаваў перайменаваньне «ін'яза» ва унівэрсытэт. А адна выкладчыца паважна сказала, што баламут «меў выразна акрэсьленую мэту». Што б гэта магло значыць?

**Вінцук ШОСТКА**

## Беларусаў таксама лічаць небясьпечнымі

**Напрыканцы кастрычніка супрацоўнікам аднае беларускай фірмы дывялося па камэрцыйных справах наведаць старажытны расейскі горад Пскоў. І вось там яны па-сапраўднаму адчулі ўзьдзеяньне адразу ўсіх «зон», «союзов», «благоприятных режимов» і г.д., якія несупынна прапагандуе наш шаноўны прэм'ер.**

Па-першае, камэрсанты зьдзівіліся, што кантрольна-прапускныя пункты на беларуска-расейскай мяжы існуюць і нават сваімі аўтамабільнымі чэргамі мала чым адрозьніваюцца ад памежных пераходаў у Берасьці ці Горадні. Расейскія міліцыянты-памежнікі зь непрыхаваным задавальненьнем паведамілі, што «беларусам у хуткім часе давядзецца плаціць каля 20% ад агульнага кошту грузу за эксплюатацыю расейскіх дарогаў».

Аднак найбольш ўражаньняў беларускія грамадзяне атрымалі ад своеасаблівай расейскай «гасьціннасьці». Рэч у тым, што ў пскоўскіх гатэлях спэцыяльным указам забаронена пасяляць грамадзянаў Казахстана, Украіны і Беларусі. Прычыну зьяўленьня такой дыскрымінацыйнай пастановы ў дачыненьні да нашых суайчыньнікаў высьветліць не ўдалося. Адным словам, «не положено» і ўсё!

Відаць, у Расеі зараз баяцца ня толькі «лиц кавказской национальности», але і беларусаў. Толькі за што? **Я.З.**

## Эўропа: кошты вялікіх гарадоў (ў далярах)

| | Лёндан | Амстэрдам | Барсэлёна | Брусэль | Дублін | Франкфурт | Жэнэва | Мілан | Осла | Парыж |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гасцініца[1] | 333,61 | 260,29 | 213,31 | 331,21 | 191,25 | 204,20 | 239,23 | 184,50 | 201,96 | 310,97 |
| Таксі[2] | 59,84 | 26,28 | 10,65 | 22,26 | 17,32 | 35,52 | 19,99 | 15,63 | 12,91 | 33,62 |
| Таксі[3] | 8,98 | 5,94 | 8,53 | 5,57 | 6,66 | 4,95 | 8,00 | 6,25 | 5,45 | 3,02 |
| Тэлефон[4] | 0,30 | 0,39 | 0,54 | 0,42 | 0,42 | 0,60 | 0,27 | 0,63 | 0,27 | 0,40 |
| Сьнеданьне[5] | 19,37 | 15,51 | 17,05 | 15,30 | 9,35 | 17,16 | 18,00 | 19,70 | 13,19 | 21,86 |
| Арэнда аўтамабіля[6] | 84,52 | 71,06 | 94,86 | 198,07 | 75,85 | 76,25 | 124,03 | 138,05 | 124,86 | 119,35 |
| Сакратар[7] | 115,19 | 315,51 | 87,02 | 250,49 | 194,02 | 307,79 | 373,16 | 62,55 | 171,32 | 226,81 |
| Факс[8] | 4,49 | 7,97 | 3,55 | 1,80 | 6,93 | 0,60 | 3,34 | 2,50 | 1,36 | 2,53 |
| Абед на 4 асобы | 302,79 | 205,86 | 99,18 | 306,16 | 185,70 | 189,41 | 499,78 | 312,71 | 197,16 | 235,32 |
| Кубак кавы | 1,12 | 1,26 | 0,88 | 1,39 | 0,84 | 2,06 | 2,33 | 0,75 | 2,72 | 2,02 |

1 Аднамясцовы нумар ў 4-зоркавым гатэлі
2 Ад аэрапорта да цэнтра горада
3 2 км па горадзе
4 3-хвілінная размова ў гарадзкой тэлефоннай будцы
5 Для 1 асобы ў 4-зоркавым гатэлі
6 Стаўка на 1 дзень
7 Стаўка на 1 дзень
8 Адна стандартная старонка

*Па матар'ялах замежнага друку*



Падпісны індэкс 63887. Нумар падпісаны ў друк 4.11.93. Друкарня "Беларускі Дом Друку". Замова 1582 Наклад 20 000. П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010